# З НОВЫМ НАВУЧАЛЬНЫМ ГОДАМ!




## ПОСПЕХАЎ У ВУЧОБЕ!

Гэты дзень заўсёды хвалюе. Хвалюе ён і студэнтаў і выкладчыкаў. Хвалюе ўсіх, каму універсітэт родны дом, хто тут працуе, вучыцца, дбаючы заўсёды аб адным — каб на дабро Радзімы ішла праца, каб яна ўлівалася ў рэчышча ўсенароднага клопату аб дні сённяшнім і будучым, аб вялікай справе пабудовы камунізма.

Новы навучальны год наш універсітэт сустракае шмат ў чым па-новаму: падарункам нашаму студэнцтву стаў новы вучэбны корпус радыёфізікі і электронікі, новым абсталяваннем сустракаюць студэнтаў многія лабараторыі і кабінеты, новай літаратурай бясконца папаўняецца фонд бібліятэкі.

З гэтага года пачынае рыхтаваць універсітэт шэрагі спецыялістаў па новых для яго профілях — пры гістарычным факультэце адкрылася філасофскае аддзяленне, пры юрыдычным — эканамічнае, пры геаграфічным — геалагічнае.

Асаблівасцю сёлетняга набору ва універсітэт з'яўляецца значнае яго павялічэнне ў параўнанні з мінулагоднім. Зараз усяго на першыя курсы ўсіх факультэтаў залічана больш, за дзве тысячы чалавек. Характэрна, што значна пашыраны набор на ўсе факультэты. Гэта яскравы прыклад бясконцых клопатаў Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада аб нашай моладзі.

Перад студэнтамі стаіць галоўная мэта — упартая, сістэматычная, удумлівая вучоба. У вашым распараджэнні ўсе ўмовы для таго, каб стаць спецыялістам, каб прынесці максімальную карысць Радзіме, народу.

З новым навучальным годам, дарагія сябры! Новых вам поспехаў у вучобе, плённай працы, новых удач на шляху да высакароднай мэты!

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя Ул. І. ЛЕНІНА

№ 24 (647) Чацвер, 1 верасня 1966 года. Год выдання XIX. Цана 2 кап.

## ПАМНАЖАЦЬ СЛАЎНЫЯ СПРАВЫ КАМСАМОЛІІ!

Наша Беларусь разам з іншымі рэспублікамі Савецкага Саюза ўпэўненымі крокамі ідзе па шляху будаўніцтва новага камуністычнага грамадства. Кожны новы працоўны крок набліжае нас да слаўнага будучага, паляпшае матэрыяльныя ўмовы жыцця, узнімае эканамічную і палітычную магутнасць Радзімы.

На фабрыках, заводах, у школах і вну, калгасах і саўгасах, на розных іншых прадпрыемствах і ў культурных установах працуюць выпускнікі нашага ўніверсітэта. Яны з гонарам нясуць працоўную вахту, добрасумленнымі адносінамі да яе памнажаюць гонар і славу нашага вну.

Цяпер у студэнцкую сям'ю універсітэта ўліўся шматлікі калектыў першакурснікаў, юнакоў і дзяўчат, якія прыйшлі да нас, каб стаць высокакваліфікаванымі спецыялістамі. Вядома, лёгка сказаць, высокакваліфікаваны спецыяліст. А на справе — гэта вывучэнне твораў Маркса, Энгельса, Леніна, рашэнняў Партыі і Урада, штодзённыя заняткі ў лабараторыях і кабінетах. Шмат прыйдзецца папрацаваць. Аўдыторыі вучэбных карпусоў, інтэрнат стануць для вас роднымі і блізкімі.

Камуністычная партыя і Урад праяўляюць вялікія штодзённыя клопаты аб падрастаючым маладым пакаленні. Узводзяцца ўсё новыя і новыя карпусы. Неўзабаве закончыцца будаўніцтва новага хімічнага корпуса, дзе будуць створаны ўсе неабходныя ўмовы для падрыхтоўкі высокакваліфікаваных хімікаў, бо Беларусь становіцца рэспублікай вялікай хіміі. Шматбаковае яе прымяненне ў народнай гаспадарцы і прамысловасці, далейшыя

(Заканчэнне на 2 стар.)

*Заўтра—21 гадавіна Дэмакратычнай Рэспублікі В'етнам.*

## В'ЕТНАМСКІ НАРОД ПЕРАМОЖА!

В'етнамскі народ, які мае шматгадовыя рэвалюцыйныя традыцыі, ні на імгненне не спыняў барацьбы за свабоду і незалежнасць з таго самага дня, калі французскія імперыялісты сілай зброі навязалі сваё панаванне.

19 ліпеня 1945 года пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі Індакітая ўвесь в'етнамскі народ ўзняўся на ўсеагульнае паўстанне. Наш народ захапіў уладу ў свае рукі.

2 верасня 1945 года на гістарычнай плошчы Ба-дзінь прэзідэнт Хо Шы Мін перад усім светам абвясціў аб незалежнасці В'етнама. Была створана Дэмакратычная Рэспубліка В'етнам — краіна народнай дэмакратыі, якая паставіла сваёй мэтай завяршэнне нацыянальна-дэмакратычнай рэвалюцыі і пераход па марксісцка-ленінскім шляху да сацыялістычнай рэвалюцыі. Дзяржаўнага ладу такога тыпу тады яшчэ не ведала ніводная былая каланіяльная ці паўкаланіяльная краіна.

Імперыялісты розных краін прыкладвалі і прыкладваюць усе намаганні, каб спыніць в'етнамскі нацыянальны рух. Дзевяцігадовая вайна Супраціўлення закончылася бліскучай перамогай нашага народа. Мы ўпэўнены, што і барацьба народаў Паўднёвага В'етнама супраць амерыканскага імперыялізму таксама будзе пераможнай, бо разам з в'етнамскім народам ідзе поруч у гэтай барацьбе ўсё прагрэсіўнае чалавецтва.

Заўтра 21 гадавіна ДРВ. Вось ужо ў пяты раз мы, в'етнамскія студэнты, сустракаем сваё светлае свята на савецкай зямлі — у Беларускім дзяржаўным універсітэце імя Ул. І. Леніна. Гэта ўжо шмат гаворыць пра тое, якая ў нас добрая дружба.

Вялікую дапамогу нашай рэвалюцыі аказвае Савецкі Саюз. Нас з вамі, дарагія савецкія сябры, звязвае непарушная братняя еднасць. Пачуццё дружбы і ўдзячнасці савецкаму народу — гэта адно з самых гарачых пачуццяў нашага народа.

Н. К. МІНЬ.

# ПАМНАЖАЦЬ СЛАЎНЫЯ СПРАВЫ КАМСАМОЛІІ

*(Працяг. Пач. на 1-й стар.).*

буйныя перспектывы развіцця ўскладняюць на студэнтаў-хімікаў адказныя задачы. Кваліфікаванага хіміка чакае і Гомельскі суперфасфатны, і Гродненскі азотнатукавы, Салігорскі і Светлагорскі камбінаты і многія іншыя прадпрыемствы рэспублікі.

Першакурснік! Сёння ў цябе асаблівы дзень. Ты пачынаеш новую старонку ў сваёй біяграфіі. Стаць студэнтам—гэта сапраўднае свята. Не кожнаму дадзена завяваць яго. Але яшчэ цяжэй будзе авалодаць неабходнымі ведамі.

Камсамолія універсітэта мае слаўныя традыцыі. Іх многа, ты пазнаеш іх у працэсе вучобы. Але гэтыя традыцыі не даюць табе ніякага права зазнавацца, лічыць сябе нейкім асаблівым чалавекам. Слаўнымі справамі табе трэба памнажаць аўтарытэт нашай арганізацыі. Табе заўсёды знойдзецца месца, дзе ты зможаш праявіць свой талент і ўменне. Патрэбны толькі настойлівасць, жаданне дасягнуць сваёй мэты ў жыцці. Ва універсітэце цябе чакае многа новага, цікавага, невядомага. Навука раскрые табе шырокія гарызонты. Цябе чакаюць турысцкія паходы, спартыўныя лагеры, чакае блакітная планета «Цаліна», будоўлі Беларусі, прафесіянальныя студэнцкія калектывы мастацкай самадзейнасці, факультэт грамадскіх прафесій, дзе ты зможаш у вольны ад вучобы час набыць шмат умельства. А ў студэнцкіх навуковых гуртках ты зможаш рабіць цікавыя навуковыя даследаванні.

Камсамольцы універсітэта ў мінулым навучальным годзе прынялі Ленінскую эстафету. У чым яе мэта і задачы? Перш за ўсё ў тым, каб кожны, хто прыйшоў у наш калектыў, у аснову свайго студэнцкага жыцця ўзяў тры прынцыпы: «Вучыцца, як Ленін, працаваць, як Ленін, жыць, як Ленін». Прымаючы эстафету, камсамолія паставіла перад сабой клопат глыбока і дасканала авалодаць вучэннем вялікага правадыра, усебакова пазнаць яго грамадскую і палітычную дзейнасць.

Цудоўны і прыгожы наш горад Мінск. Тут — ўсе магчымасці, каб ты змог вучыцца, працаваць, даследаваць, цікава правесці свой вольны час. Ды галоўнае, дружа, вучоба: пра яе ты павінен думаць штодзённа. Непрыкметна прамільгнуць месяцы, і цябе сустрэне першая ў тваім жыцці сесія. Яна будзе для цябе вялікім выпрабаваннем. Верым, ты памножыш слаўныя справы нашай камсамоліі.

**Камітэт камсамола універсітэта.**

# ТУТ — ПАРАДАК!..

Рамонт студэнцкіх інтэрнатаў у гэтым годзе даводзілася рабіць у складаных умовах: завочнікі, абітурыенты, спартсмены розных рэспублік нашай краіны, якія прыехалі на V Усесаюзныя студэнцкія гульні. Увесь час інтэрнаты былі перапоўнены.

— Але нягледзячы ні на што, рамонт зроблены ўдала. Праўда, часта даводзілася перасяляць жыльцоў з аднаго пакою ў другі, каб поўнасцю вызваліць і адрамантаваць паверх... Усё рабілася аператыўна, старанна і вось бачыце,— сказаў нам камендант студэнцкага інтэрнату па вуліцы Паркавая магістраль, — усюды чысціня...

Гэты інтэрнат самы большы ва універсітэце. Тут пасялілася больш тысячы трохсот студэнтаў. Гэта вялікі і патрабавальны калектыў. Шмат клопатаў і ў студсавета. Трэба скласці неабходную і цікавую праграму вечароў адпачынку, сустрэч з першакурснікамі і знатнымі людзьмі рэспублікі.

Значны ўдзел у рамонце прынялі студэнты-старшакурснікі. Яны прыехалі сюды 25 жніўня, каб разам са спецыяльнымі рабочымі рыхтаваць жыллё для сваіх факультэтаў.

У інтэрнаце па вуліцы Свярдлова рамонт зроблены асабліва старанна. Прыемна зайсці ў ленпакоі. Сюды завозіцца новая мэбля. Усё робіцца, каб побыт студэнтаў быў добраўпарадкаваным.

Вечарам дружна свецяцца вокны інтэрнатаў. У кожным з іх, дзе нам ні даводзілася пабываць, мы бачылі ўскрылёных юнакоў і дзяўчат. У першакурснікаў на стале мноства канспектаў, у якія ўжо ў першы дзень заняткаў занесены запісы.

Студэнцкі інтэрнат! Ён стаў для цябе, першакурснік, тваім родным домам на ўсе гады вучобы! Любі свой інтэрнат, клапаціся аб яго ўтульнасці і чысціні. Цяпер парадак у ім будзе залежаць і ад цябе!

**Рэйдавая брыгада газеты «Беларускі універсітэт».**



По старадаўняму народнаму звычаю студэнты нашага універсітэта і працаўнікі саўгаса «Чырвоная зорка» Клецкага р-на сустрэлі групу чэхаславацкіх студэнтаў «хлебам-соллю».

# У ВАС БЫЛО ЦУДОЎНА

*З 31 ліпеня па 22 жніўня мы працавалі ў калгасе «Чырвоная зорка» Клецкага раёна Мінскай вобласці. Знаходжанне ў Беларусі зрабіла на нас вялікае ўражанне. Добрыя ўспаміны засталіся ў нашых сэрцах аб работніках саўгаса і студэнтах Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя Ул. І. Леніна. Нам нават і не сніўся такі шчыры і цёплы прыём, які мы бачылі ўсюды, дзе б нам ні даводзілася бываць. Скрозь мы адчувалі пачуццё любві і братэрства, прыхільнасці да нашага народа.*

*У непарушных адносінах народаў Савецкага Саюза і Чэхаславацкай Сацыялістычнай Рэспублікі мы ўпэўніваліся на кожным кроку.*

*Пачуццё вялікай дружбы заснавана на разуменні і давер'і, таму нашы гаспадары паказвалі нам усё так, як ёсць на самай справе.*

*Нідзе мы яшчэ не сустракалі такога цёплага прыёму, як у вас. Верце, што мы яшчэ вернемся да вас, таварышы. Дружба паміж Беларускім дзяржаўным універсітэтам, які носіць імя вялікага правадыра народаў свету, і Пльзенскім інстытутам будаўніцтва і электратэхнікі не зможа ніколі пагаснуць, як і дружба нашых народаў.*

*Група чэхаславацкіх студэнтаў.*

# З УЗНАГАРОДАЙ, СЯБРЫ!

«PRAVDA» — *орган Заходне-Чэшскага абласнога камітэта КПЧ за 14 жніўня 1966 года.*

ПЛЬЗЕНЬ: Учора кіраўніцтва абласнога камітэта Чэхаславацкага саюза моладзі ў Пльзені прыняло групу з 11 савецкіх студэнтаў, якія працавалі ў нас будаўнікамі на Шляхціцельскім прадпрыемстве ў Тэпле. Маладыя савецкія студэнты з Мінска былі ўзнагароджаны за свае працоўныя справы ганаровымі значкамі ЧСМ, а ўся брыгада атрымала ганаровую грамату абласнога камітэта ЧСМ.

□ □

«PRAVDA» *за 5 жніўня.*

ТЭПЛА. У сераду вечарам на дзяржаўным прадпрыемстве ў Тэпле адбыўся шматтысячны мітынг пратэсту супраць амерыканскай агрэсіі ва В'етнаме, арганізатарам якога была сельская арганізацыя ЧСМ. На мітынгу сабраліся мясцовыя члены ЧСМ, група студэнтаў у трыццаць чалавек з БДУ імя Ул. І. Леніна з Мінска, студэнты Пльзенскіх вну, якія працуюць у Тэпле і салдаты. В'етнамскія студэнты, якія навучаюцца ў Пльзеньскіх інстытутах будаўніцтва і электрафікацыі, расказалі ўдзельнікам мітынгу аб жыцці моладзі ў сваёй краіне, аб сучасным становішчы ў В'етнаме. Слова таксама ўзяў кіраўнік групы савецкіх студэнтаў Ігар Шынглер, які гаварыў аб дапамозе Савецкага Саюза В'етнаму.

У заключэнне мітынгу студэнты паслалі рэзалюцыю пратэсту пасольству ЗША ў Празе, у якой асуджаюцца варварскія дзеянні амерыканцаў, агрэсараў у Паўднёвым В'етнаме і патрабуюць выводу іх з паўднёвай часткі краіны. Студэнты паслалі таксама рэзалюцыю ў ЦК КПЧ, у якой выражаюць сваю згоду з пазіцыяй прадстаўнікоў краін Варшаўскага Дагавору, выражаную ў Бухарэсце ў адносінах да агрэсіі ЗША ў В'етнаме.

# КАЛІ ТЫ ЭНТУЗІЯСТ

Мастацкая самадзейнасць нашага універсітэта мае багатую традыцыю. Яе цікавыя канцэрты горача палюбілі гледачы Мінска, Гомеля, Віцебска, Брэста, Магілёва, Гродні. А колькі разоў нашы спевакі выязджалі ў калгасы і саўгасы, воінскія часці. Шчырае прызнанне атрымала мастацкая самадзейнасць нашага універсітэта і за межамі рэспублікі. Юнакі і дзяўчаты спявалі беларускія народныя песні ў Літве, Латвіі, Эстоніі, на Украіне, у Ленінградзе і іншых гарадах краіны. А на III Дэкадзе самадзейнага мастацтва БССР Народная харавая капэла заваявала Дыплом II ступені.

Кожнаму першакурсніку трэба вырашыць пытанне: які з гурткоў мастацкай самадзейнасці яму да спадобы. У гэтым годзе творчы калектыў мастацкай самадзейнасці трэба папоўніць новымі сіламі.

Энтузіясты мастацтва, вясёлыя, вынаходлівыя юнакі і дзяўчаты, як мы іх называем «фанатыкі», такія, як Аляксей Дзегцяроў, Тамара Скудная, Галя Гаўрык, патрэбны ў нашых шарэнгах.

А калектывы ў нас розныя не толькі ў жанравых адносінах, але і ў багацці традыцый. Калі такія, як Народная харавая капэла і аркестр Народных інструментаў, ужо даўно карыстаюцца заслужанай славай і носяць ганаровыя званні Народных, то студэнцкі тэатр і нядаўна створаны эстрадны аркестр яшчэ толькі пачынаюць заваёўваць прызнанне і папулярнасць.

У студэнцкага тэатра пачын вельмі ўдалы. Ён змог, напрыклад, паставіць на сцэне псіхалагічную п'есу Артура Лаўрэнса «Вестсайдская гісторыя», якую гледачам пашчасліўіцца ўбачыць 17 верасня гэтага года на сцэне нашага універсітэта. Дарэчы, сцэна ўжо цяпер не такая, як была раней, яна прыстасавана па свайму асвятленню і механізаванасці да тэатральнай.

Значна вырас за лета і наш эстрадны аркестр. Зараз у яго складзе тры саксафоны, дзве трубы, трамбон (без трамбаніста пакуль—просім ахвотніка), электрагітара, кантрабас, піяніна і іншыя музычныя інструменты.

Мяркуем у гэтым годзе стварыць эстрадны ансамбль з удзелам вакальных груп, салістаў і танцораў.

І так ва ўсіх калектывах: свае планы, свае мары. Чакаць няма калі: пачынаюцца канцэрты, выезды да шэфаў.

Прыходзь да нас, першакурснік, тут чакаюць цябе цікавыя, карысныя і патрэбныя справы.

**В. ЛІТВІНКА,**
**старшыня праўлення студэнцкага клуба універсітэта.**

# ПРАЙШЛІ ДАСТОЙНЫЯ

Закончыліся ўступныя экзамены ва універсітэце. Былыя абітурыенты, а цяпер студэнты сядзяць на лекцыях, знаёмяцца з выкладчыкамі, бібліятэкай. Яны заваявалі права на гэта нястомнай і напружанай працай.

Так, у большасці толькі тыя, хто здаў экзамены на «выдатна», атрымаў білет студэнта БДУ імя Ул. І. Леніна. Вось паслухайце сакратароў прыёмных экзаменаў, з якімі мне давялося пагутарыць.

Е. В. Паўловіч — сакратар прыёмнай камісіі аддзялення радыёфізікі і электронікі:

— Наш факультэт—адзін з самых лепшых і папулярных факультэтаў універсітэта. Імкненне паступіць сюды ў нашай моладзі вельмі вялікае. На факультэце выдатныя выкладчыкі, выпускнікі яго працуюць на вытворчасці і ў школах краіны. Многія вучацца ў аспірантуры. Не дзіўна, што сюды было пададзена 535 заяў. Былі сярод іх і ўжо ўмудроныя працай на вытворчасці «стажнікі» і яшчэ зусім нясмелыя юнакі і дзяўчаты са школ. Экзамены—цяжкія. Ды іх і больш, чым пры здачы на іншыя факультэты. Прафіліруючых тры: фізіка і матэматыка (пісьмовая, вусная). Увогуле абітурыенты выявілі выдатны запас ведаў. Прахадны бал ніжэй быць не мог—пятнаццаць па прафіліруючых дысцыплінах. Аб тым, як праходзілі ўступныя экзамены, добра сведчыць наступны факт. На фізічны факультэт паступала 225 медалістаў, а паступіла толькі 105. Хочацца адзначыць і тое, што з кожным годам да нас ва універсітэт прыходзіць усё больш і больш падрыхтаваная моладзь. Гэта не можа не радаваць.

Сакратар прыёмнай камісіі А. П. Рогач дадаў:

— Хімікі трымалі экзамены па чатырох дысцыплінах. У нас таксама прафіліруючых—тры. Прахадны бал—пятнаццаць па прафіліруючых дысцыплінах. У нас, сакратароў прыёмных камісій, было вельмі многа работы. Хацелася ўсё рабіць так, каб не сапсаваць настрой абітурыенту, бо не сакрэт, што большасць з іх знаёмілася з работай і абставінамі ва універсітэце, пачынаючы з сакратара прыёмнай камісіі. Ад настрою абітурыента ў многім залежала тое, як ён здасць першы экзамен. Хочацца верыць, што нашай работай засталіся задаволены ўсе абітурыенты.

Высокі прахадны бал быў і на філалагічным, юрыдычным, біялагічным і гістарычным факультэтах нашага універсітэта.

І. Капыловіч,
студэнт чацвёртага курса аддзялення журналістыкі.



*Падзеі дня заўсёды хвалююць. Таму не дзіўна, што з такой цікавасцю студэнты чытаюць свежыя нумары газет.*

# ШЧЫРА, З НАТХНЕННЕМ

**Абітурыент Разанаў пісаў сачыненне на вольную тэму: «Шчасце трэба ў суровым змаганні здабыць». Друкуем яго без змен.**

*Вельмі многа ў свеце дарог.*
*Па якой пайсці, якую выбраць,*
*каб яна была на ўсё жыццё?..*

*А шлях раўнюткі, быццам*
*лісцік!*
*Ляці,*
*Каб вецер у вушах!..*
*О, як жа горка памыліцца*
*І па чужых*
*пайсці шляхах,*
*Няхай яшчэ імклівей стрэлаў,*
*Няхай шырокія яны...*
*Стаю адзін.*
*У небе*
*дрэвы*
*І жураўліныя кліны;*
*Лісты апаўшыя на стрэсе...*
*Але чакай,*
*няўмольны час!*
*Я маю права*
*ўсё закрэсліць*
*І потым нанава пачаць.*
*Я не веру ў лёгкае шчасце. Здабудзь яго, калі гэта здаецца нават немагчымым.*
*Тваё бары ў цішы напеўнай*
*Страляюць строма ў вышыню,*
*Твая зара бунтуе гнеўна,*
*Як кроў,*
*як полымя агню.*
*Дымяцца горача, як рана,*
*Тваё*
*рачныя паплавы...*
*Задумаў велічную справу*
*І абвясці:*
*«Іду на вы!»*
*Сівы стары хісне плячыма*
*І, быццам гледзячы ў ваду,*
*Прамовіць мудра: «Немагчыма,*
*Як два разы быць маладу».*
*Пакажа доўгія разлікі*
*І стосы спісаных папер,*
*А ты*
*ў рашучасці вялікай*
*Яму сягодня не павер.*
*Не адступаючы ні разу,*
*Пякельным факелам пылай*
*Твая энергія, як лазер,*
*Разрэжа вецер папалам.*
*Праб'е*
*без грозных грукатанняў*
*Свяціла выпучаны шчыт*
*І сумны свет другою гранню*
*Перад табою заблішчыць.*
*Калі абдыме часам вочы*
*Сумленне*
*хмараю сівой,*
*Застынь у роздуме паўночным*
*Сам — насам з мэтаю сваёй.*
*Хай над табой агнямі Прэсні*
*Пылаюць ягады рабін.*
*Паўстань,*
*распніся,*
*уваскрэсні*
*І немагчымае зрабі!*
*Леў Талстой казаў, што дасягнуць чаго-небудзь значнага можна толькі тады, калі ўсе твае імкненні і сілы, нібы праменні праз лінзу, будуць накіраваны ў адну кропку. Сваю мэту я ведаю. І буду шчаслівы, калі дасягну яе.*
*Мэта,*
*Навошта ты з вяршынь*
*крылатых*
*За мной паслала пасланца?..*
*І вось брыду, нібы пракляты,*
*Дарогай торнай без канца.*
*Не адпачыць,*
*Не разагнацца,*
*Не захілішца ад абраз.*
*А саступіць —*
*і столькі цацак*
*І столькі радасцей ураз.*
*Нахлыне душная знямога,*
*Прымірыць з думкаю слабой...*
*Але*
*без гэтае дарогі*
*Я перастаў бы*
*быць сабой.*
*Шчасце можна дасягнуць у працы, працы на карысць Радзіме. Працаваць, дык не шкадуючы сябе, каб кожны рух быў накіраваны на дасягненне вялікага і новага.*
*...Лясной затуленай ажынай*
*Я адкрыццё ўбачу ў сне.*
*У буйстве мар,*
*У буйстве жылаў*
*Яго шукаў я па вясне.*
*Трызненне лічбамі ўночы,*
*А прабуджэнне —*
*сну працяг.*
*Як неабходнейшую ношу,*
*Цягаў я*
*пошук адкрыцця.*
*Вядома, праца працы розніца. Праца не можа даць шчасця чалавеку, калі ён не ўлюбёны ў яе.*
*І чуюць ад дзедаў унукі,*
*Што колісь —*
*як жудасны сон —*
*Уздымаліся цяжкія рукі —*
*«Праклён нашай працы!*
*Праклён!»*
*Асабліва горача марыць пра шчасце моладзь.*
*Маладосць!*
*Уварвалася*
*ў ранішні золак,*
*Захапіла, як песня і бой,*
*Асляпіла агнямі вясёлак*
*І паклікала за сабой.*
*Загадала быць мужным*
*і шчырым*
*У астрозе*
*няўдач і бед.*
*І ці мне*
*праз палосачкі шчылін*
*Пазіраць на вялізны свет?*
*І ці мне*
*заціхаць перад стомай*
*І спыняцца на паўшляху,*
*І шчацінай,*
*сляпою і соннай,*
*Затуляць ад вятроў шчаку?*
*І пылаць*
*дзеля славы і платы*
*І сабе прысвячаць свой бег?..*
*Я іду*
*з маладосцю крылатай*
*У трывожны, нязведаны век.*
*Сваё шчасце, сваю Радзіму трэба барагчы і ахоўваць.*
*Калі я траплю ў акружэнне*
*Варожых твараў і вачэй,*
*Калі туга,*
*як паражэнне,*
*Балюча сэрца апячэ,*
*З зямлі*
*любімай і пакутнай,*
*З-за купкі тоненькіх бяроз,*
*Непадуладны,*
*Усемагутны,*
*Я ўздымуся ў поўны рост;*
*Ступлю*
*сцяжынкаю крылатай*
*Насустрач будучай вясне...—*
*І сэрца выбухам гарматы*
*Пануры дол устрасяне.*

# ЯК КАРЫСТАЦЦА БІБЛІЯТЭКАЙ?

**Першакурснік! Кніжны фонд бібліятэкі нашага універсітэта адзін з буйнейшых у рэспубліцы. З учарашняга дня табе дазволена карыстацца ім. У бібліятэцы створаны ўсе неабходныя ўмовы для чытача. Сёння мы друкуем правілы карыстання бібліятэкай.**

## І. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

Запіс чытачоў праводзіцца пры прад'яўленні пашпарта і студэнцкага білета, службовага пасведчання, на падставе якіх бібліятэка выдае пастаянны адзіны білет чытача. Бібліятэка штогод праводзіць перарэгістрацыю чытачоў. Пры перарэгістрацыі чытач павінен здаць для уліку літаратуру, якая лічыцца за ім і якую ён зможа атрымаць зноў пасля перарэгістрацыі. Чытачы, якія не прайшлі перарэгістрацыі, бібліятэкай не абслугоўваюцца.

Студэнты і аспіранты перад летнімі канікуламі павінны здаць усе кнігі, якія лічацца за імі.

Аб змяненні месца работы, вучобы або адраса чытач павінен паведаміць у бібліятэку ў 10-дзённы тэрмін.

## ІІ. ПАРАДАК КАРЫСТАННЯ ЛІТАРАТУРАЙ

### а) ПА АБАНЕМЕНЦЕ

Навуковая літаратура выдаецца чытачам на тэрмін да двух месяцаў.

Тэрмін карыстання кнігай можа быць прадоўжаны пры ўзгадненні з работнікамі абанемента.

Для студэнтаў-завочнікаў тэрміны карыстання падручнікамі ўстанаўліваюцца ў залежнасці ад тэрмінаў правядзення лабараторна-экзаменацыйных сесій.

Не выдаюцца на дом рэдкія і каштоўныя выданні, дысертацыі, аўтарэфераты, рэфератыўныя часопісы, газеты, а таксама кнігі, атрыманыя па міжбібліятэчнаму абанементу.

У выпадку затрымкі кніг звыш устаноўленага тэрміну без уважлівых прычын чытач пазбаўляецца права карыстання бібліятэкай на 1—2 месяцы.

Па міжбібліятэчнаму абанементу літаратура выдаецца абанементам на адзін месяц.

### б) У ЧЫТАЛЬНЫХ ЗАЛАХ

Кнігі з дапаможных фондаў чытальных залаў кнігасховішчаў выдаюцца па вуснаму патрабаванню або патрабавальных лістках.

Выносіць кнігі з чытальнай залы не дазваляецца. Выходзячы з чытальнай залы на працяглы час, чытач павінен здаць кнігі дзяжурнаму бібліятэкару.

Кнігі з кабінетаў і лабараторый на дом не выдаюцца.



# ДЗЕНЬ ДОБРЫ, ЦАЛІННІКІ!

Дваццаць сёмага жніўня. Шэсць гадзін вечара. Да вакзала падыходзіць поезд. На пярэднім вагоне красуецца палотнішча «Мы з цаліны!»

— Ура! Добры дзень...— З вагона выскокваюць загарэлыя юнакі і дзяўчаты.

— Абдымкі, пацалункі, кветкі. Угару ляцяць рукзакі. І адразу — песня.

Цалліннікі!.. Як і дванаццаць гадоў назад, ад гэтага слова патыхае прасторам, дужым ветрам і героікай. Цаліна... Зноў гэта слова ва ўсіх на вуснах. Гавораць самі цаліннікі:

— Працавалі два месяцы,— расказвае камандзір атрада гісторыкаў «Вікторыя» Леанід Кісель.— У пяці саўгасах здалі ў эксплуатацыю па выдатнай якасці тры кашары, школу, клуб, стадыён, новую вуліцу з дзесяткам прыгожых дамоў...

— Ад хлопцаў стараліся не адставаць,— гавораць дзяўчаты Ліда Глаз і Тамара Скудная, члены атрада «Зубронак».— Працавалі кухаркамі. Кожную свабодную хвіліну займаліся з піянерамі суседніх сёл, расказвалі казахам пра нашу далёкую Беларусь. Канцэрты, выступленні агітбрыгады, рэйды дружыннікаў па ахове будаўнічых матэрыялаў і збожжа, спартыўныя спаборніцтвы... Не стаміліся, але засумавалі па універсітэту, з нецярплівасцю чакалі заняткаў.

І вось па Прывакзальнай плошчы узмужнелыя за лета ідуць хімікі, філолагі, фізікі універсітэта, палітэхнікі, студэнты тэхналагічнага інстытута. Наперадзе калоны студэнтаў-гісторыкаў — пераходны Чырвоны сцяг Чапаеўскага РК КП Уральскай вобласці. Яны па праву заваявалі яго.

Кожнага цёпла і сардэчна вітаюць родныя і знаёмыя. Сустракаць цаліннікаў прыйшоў пенсіянер Аляксандр Грабеншчыкаў. Ён прынёс прыгожыя чырвоныя памідоры і яблыкі. Свой падарунак ён ад шчырага сэрца уручыў камандзіру атрада «Вікторыя» Леаніду Кіселю. А ўсім студэнтам — цаліннікам сказаў:

— Дзякую за працу. Добрай вам вучобы ў новым навучальным годзе!

НА ЗДЫМКУ: сустрэча студэнтаў-цаліннікаў на Прывакзальнай плошчы.

Тэкст і фота Р. КАДЗЕТА.

# ХРОНІКА ЛЕТА

**СУПРАЦОЎНІКІ** нашага універсітэта прынялі актыўны ўдзел у рабоце V Усесаюзнай навуковай канферэнцыі «Мікраэлементы ў сельскай гаспадарцы і медыцыне», якую арганізавала АН СССР у Іркуцку. На ёй разглядаліся такія важныя пытанні, як мікраэлементы ў біясферы, біяхімія і фізіялогія мікраэлементаў у раслінаводстве, біяхімія і фізіялогія мікраэлементаў у арганізме жывёл і чалавека, мікраэлементы ў медыцыне, біягеахімічныя даследаванні пры пошуках месцазнаходжання карысных выкапняў, метады даследавання мікраэлементаў і многія іншыя праблемы.

Ад біялагічнага факультэта на канферэнцыі выступілі дацэнт В. Калешка, ад геолага-геаграфічнага — кандыдаты навук А. Гаўрылава, Г. Дубікоўскі і старшы выкладчык М. Чартко.

**СТУДЭНТЫ** геолага-геаграфічнага факультэта трэціх і чацвертых курсаў пабывалі на вучэбнай практыцы на ўзбярэжжы Каўказа, дзе пазнаёміліся з прыроднымі зонамі і прамысловасцю гэтага краю.

**ГЭТЫМ ЛЕТАМ** у сталіцы Польскай Народна-Дэмакратычнай Рэспублікі сабраліся філолагі ўсяго свету, каб прыняць удзел у рабоце Міжнароднай канферэнцыі філолагаў. Прадстаўнікамі ад нашага універсітэта на ёй былі студэнткі філалагічнага факультэта Кішкель і Руткоўская.

**НАШЫ СТУДЭНТЫ** на аўтапоездзе «Дружба» наведалі Цымлянскі Міжнародны аздараўленчы лагер. Тут адпачывала моладзь розных краін свету.

**БАГАТЫЯ ТРАДЫЦЫІ** камсамоліі нашага універсітэта. Таму не дзіўна, што пазнаёміцца з жыццём, побытам, працай і вучобай камсамольцаў універсітэта прыехалі пасланцы з Чылі, Саюза свабоднай нямецкай моладзі, прадстаўнікі польскай моладзі.

**ЦІКАВЫЯ**, незабыўныя ўражанні прывезлі нашы студэнты з турысцкіх паходаў. Многім з іх пашчасліла пабываць на Каўказе, у Карэліі, Карпатах, на Паўднёвым Урале, у Забайкаллі.

**220 СТУДЭНТАЎ** адпачывала ў аздараўленчым лагеры на возеры Нарач, 80— у дамах адпачынку, 15— у санаторыях.

**НА ЦАЛІННЫЯ БУДОЎЛІ** ад нашага універсітэта выязджала 385 студэнтаў, 6 атрадаў працавала на будоўлях Беларусі. 30 пасланцоў ад нашага універсітэта працавала на будоўлях у Чэхаславакіі, 90 — на лесасплавах Цюменскай вобласці, 22 удзельнічала ў будаўніцтве Ташкента, 300—піянерважатымі ў розных школах рэспублікі.

**У СТУДЭНТАЎ** біялагічнага, хімічнага, гістарычнага, юрыдычнага і геаграфічнага факультэтаў летам праходзіла практыка.

**ВЯЛІКУЮ ЎВАГУ** да падрыхтоўкі і ўдзелу студэнтаў нашага універсітэта на V Усесаюзнай студэнцкай спартакіядзе праявілі рэктарат, партком, кафедра фізвыхавання. Спартыўны гонар нашага універсітэта адстайвалі 40 спартсменаў. Імі было заваявана 5 медаляў: адна залатая, тры сярэбраных і адна бронзавая. Усяго нашы юнакі і дзяўчаты на V Усесаюзных студэнцкіх спаборніцтвах набралі 40 ачкоў і выйшлі на чацвёртае месца сярод ВНУ рэспублікі.

**У ЦЭЛЫМ** навучальныя ўстановы нашай рэспублікі на V Усесаюзных студэнцкіх гульнях занялі агульнае пятае месца, заваявалі пяцьдзесят адну медаль (дваццаць адну залатую, семнаццаць сярэбраных і трынаццаць бронзавых).

**НА ПЕРШЫМ ПАВЕРСЕ** галоўнага корпуса нашага універсітэта знаходзіўся штаб V Усесаюзных гульняў. Ён кіраваў не толькі спартыўнымі паядынкамі на стадыёне, але займаўся таксама пытаннямі забеспячэння спартсменаў жыллём, даваў падрабязную інфармацыю шматлікаму журналісцкаму калектыву. Шмат працавалі ў штабе нашы студэнты Васіль Артамонаў і Валера Гарбачоў, а таксама загадчык спартыўнага клуба універсітэта М. А. Шэйнеман.

**НА V УСЕСАЮЗНЫХ СПАБОРНІЦТВАХ** студэнты ўстанавілі 783 рэкорды гарадоў, вобласцей, аўтаномных рэспублік, 21 рэкорд Цэнтральнага саюза спартыўнага таварыства «Буравеснік», 4 рэкорды Савецкага Саюза, 3 еўрапейскіх. Сярод 2619 удзельнікаў было 18 заслужаных майстроў спорту, 28 майстроў міжнароднага класа, больш 1200 майстроў, каля 800 кандыдатаў у майстры і звыш 600 першаразраднікаў.

# ЮБІЛЕЙ ДАЦЭНТА

30 жніўня гэтага года калектыў юрыдычнага факультэта адзначыў 60-годдзе з дня нараджэння і 35-годдзе работы ў органах юстыцыі, навукова-педагагічнай і грамадскай дзейнасці аднаго з старэйшых выкладчыкаў кафедры крымінальнага права кандыдата юрыдычных навук Мадэста Мікалаевіча Меркушава. Юбілею была прысвечана ўрачыстае пасяджэнне Савета юрыдычнага факультэта, у якім прынялі ўдзел таксама супрацоўнікі органаў пракуратуры.

Юбіляру былі ўручаны кветкі і віншаванні ад юрыдычнага факультэта, Мінскага завочнага факультэта Вышэйшай школы МООП РСФСР, пракуратуры Мінскай вобласці. Многа цёплых слоў і пажаданняў у адрас Мадэста Мікалаевіча выказалі Пракурор Беларускай ССР А. Г. Бондар, Старшыня Вярхоўнага суда рэспублікі С. Т. Шардыка. Прафсаюзная арганізацыя факультэта ўручыла Меркушаву памятны падарунак, а рэктарат, партком і мясцком узнагародзілі граматай.

Цяжкі жыццёвы шлях выпаў на долю таварыша Меркушава.

У 12 год Мадэст Мікалаевіч застаўся без бацькоў: яны памёрлі ад тыфуса ў цяжкі 1918 год. Савецкая ўлада паклапацілася аб ім, як і аб тысячах іншых дзяцей, якія засталіся сіротамі. Мадэст Мікалаевіч выхоўваўся да 1923 года ў дзіцячым доме.

У 1925 годзе пачалася працоўная дзейнасць юбіляра. Чарнарабочы меднакацёльнай майстэрні, пасля піянерважаты, тэхнічны сакратар партыйнай арганізацыі раённага Савета.

Пасля заканчэння ў 1931 годзе Ленінградскага юрыдычнага інстытута Мадэст Мікалаевіч пачаў працаваць у органах юстыцыі. Ён быў назначаны пракурорам пры Наркоме па пытаннях юстыцыі Казахскай ССР, пасля пракурорам Ак-Булакскага раёна.

З 1932 па 1934 гг. Меркушаў знаходзіўся на партыйнай рабоце, пасля працаваў памочнікам пракурора Акцюбінскай вобласці.

У 1936 годзе юбіляр паступіў у аспірантуру Ленінградскага юрыдычнага інстытута, а праз пяць год ён абараніў кандыдацкую дысертацыю. Вайна перарвала выкладчыцкую дзейнасць Меркушава ў Ленінградскім юрыдычным інстытуце. У гэтыя суровыя гады Мадэст Мікалаевіч знаходзіўся ў арміі, яму прыйшлося перанесці ўсе цяжкасці блакады горада Леніна. Па 1943 год ён быў членам ваеннага трыбунала Ленінградскага фронта, затым старшым інспектарам—рэвізорам Галоўнага Упраўлення ваенных трыбуналаў Савецкай Арміі.

У пасляваенныя гады юбіляр вярнуўся да навукова-педагагічнай дзейнасці. Каля трох год ён працаваў у Казанскім юрыдычным інстытуце, а пасля перайшоў на работу на юрыдычны факультэт нашага універсітэта.

На працягу дзевятнаццаці год Мадэст Мікалаевіч узначальваў кафедру савецкага крымінальнага права, доўгі час быў дэканам факультэта.

На працягу работы ў нашым калектыве Меркушаў праявіў сябе, як вопытны выкладчык. Ён карыстаецца вялікай павагай і аўтарытэтам сярод студэнтаў і супрацоўнікаў факультэта і універсітэта.

Таварышам Меркушавым было надрукавана шмат навуковых артыкулаў у часопісе «Вучоныя запіскі» і іншых зборніках. Ён з'яўляецца сааўтарам вучэбніка для юрыдычных школ і Каментарыяў да Крымінальнага кодэкса БССР. Працяглы час ён быў рэцэнзентам Вышэйшай атэстацыйнай камісіі. Падрыхтаваў чатырох кандыдатаў навук.

Вось ужо на працягу многіх год юбіляр—член грамадскага савета пры Прэзідыуме Вярхоўнага Савета БССР, навукова-кансультатыўнага савета пры Вярхоўным судзе рэспублікі і метадычнага савета Пракуратуры Беларускай ССР. Ён часта выступае з дакладамі. За актыўны ўдзел у рабоце таварыства «Веды» і грамадскага універсітэта савецкага заканадаўства пры Мінскім ГК КПБ Мадэст Мікалаевіч неаднаразова ўзнагароджваўся граматамі.

Мадэст Мікалаевіч шмат увагі і клопатаў аддае навукова-даследчай рабоце студэнтаў, аказвае вялікую дапамогу навуковаму гуртку па крымінальнаму праву.

Наперадзе ў юбіляра клапатлівыя гады навукова-педагагічнай і грамадскай дзейнасці. Жадаем вам, Мадэст Мікалаевіч, далейшых поспехаў у навуковай і педагагічнай рабоце.

**І. ЦІШКЕВІЧ,**
загадчык кафедры крымінальнага права.

# У ЗАБАЙКАЛЬСКАЙ ТАЙЗЕ

**Студэнцкі год мае тры семестры. Трэці—працоўны. Ён толькі што закончыўся. Працоўны семестр паклікаў студэнтаў нашага універсітэта ў розныя куткі нашай неабсяжнай краіны: на цаліну, у Сібір, Крым, на Поўнач. Многім пашанцавала пабываць у братняй Чэхаславакіі. Дзе толькі не чуліся звонкія беларускія песні, мова! Відаць, застануцца на доўга, доўга ў памяці многім працалюбівыя студэнты Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя Ул. І. Леніна. Бо чаму ж такое мноства пісем прыходзіць са зваротнымі адрасамі тых мясцін, дзе працавалі студэнты. Завязалася моцная, незабыўная дружба. А колькі прывезлі з сабой студэнты розных уражанняў, шчырых успамінаў! За часы будаўнічага семестра нашы юнакі і дзяўчаты набылі шмат розных новых спецыяльнасцей. Аб тым, як яны працавалі, адпачывалі і марылі, мы і пачнем расказваць сёння.**

Тут рэдка калі бываюць людзі. Сяды-тады хіба толькі загляне ляснік ці ў пошуках здабычы рэдкі паляўнічы, бо не пад сілу абыйсці ўвесь гэты лясны абшар. Таму, бадай, кожнага здзівіла б тое, што сярод невялічкай лясной палянкі, якая прытаілася між густых соснаў і маладога асінніку, вырас палатачны гарадок. Хто ведае, можа тут упершыню пасяліўся чалавек за гады, на працягу якіх вырасла гэтая вось вялізная хвоя. Каля яе ўпарта гаспадараць навасёлы. Прыладкавалі невялічкі столік. А побач нехта прымацаваў шыльду «Умывальнік». Відаць, шыльду тут і прымацавалі толькі таму, што ніхто не зможа прыняць простае вядро са шклянкай за ўмывальнік.

Якая непаўторная прыгажосць і дзівосная навокал прырода! Ледзь толькі пачнуць цадзіцца першыя праменні сонца праз густыя кроны дрэў, толькі-толькі пачне ўставаць туман, нехта, паглядзеўшы на ўсход, пачынае хутка забіхацца ля агню. Гэта дзяжурны. А праз хвіліну-другую падымаецца на ногі ўвесь лагер...

Вось так заўсёды пачынаецца ў лесабудаўнікоў рабочы дзень. У Забайкаллі мноства студэнтаў не толькі нашага універсітэта, але і з розных іншых інстытутаў і тэхнікумаў Беларусі. Мабыць, многім з вас ніколі ў жыцці не прыходзілася бываць лесабудаўнікам. А працуем мы так: размяжоўваем лес на кварталы, прасякаючы вузенькія «візіры» і шырокія лініі. На стыках кварталаў (адзін квартал займае плошчу адзін квадратны кіламетр) ставім слупы і пішам адпаведны нумар квартала. Ды не падумайце, сябры, што ўсё гэта так проста і звычайна. Рабочы-лесабудаўнік павінен быць кваліфікаваным лесарубам і плотнікам. Скажу па шчырасці, работа не з лёгкіх.

Сабралася тут у асноўным тая моладзь, якая памяняла дамашнюю ўтульнасць на рабочыя клопаты.

Вася Шылевіч хваляваўся. А раптам снеданне не атрымаецца. Як тады глядзець на таварышаў. Кожны, мусіць, не раз паздзекуецца: «Эх, студэнт, студэнт, супу не можаш зварыць. Такі ты, відаць, і ў рабоце». А помніць жа ён, як яшчэ некалі ў Мінску запэўніў сяброў, што будзе працаваць старанна. А тут...

Вася рабіў выгляд, што са смакам уплятае страву, а на самай справе накрадкам пазіраў на ўсіх. І калі пачалі прасіць «ДП», прагаварыўся:

— Вось гэта суп!

Усе пачалі хваліць кухара.

Мікалай Грачоў вопытнейшы за Васіля. Ён яшчэ да паступлення ва універсітэт працаваў у экспедыцыі. Для яго ўсё не ў навіну. Ён побач са старымі рабочымі маракаваў нешта ля карты, паказваў пальцамі, адкуль лепш пачынаць рабіць «візіры». Нам жа не цярпелася, хутчэй хацелася раскусіць сакрэты сваёй работы...

Вось ужо тыдзень, як мы ўсё больш і больш уціскаемся ў непралазны хмызняк. Лес такі густы, што іншы раз за некалькі крокаў не ўбачыць суседа. У большасці стромкія, аброслыя ад вільгаці сівым мохам векавыя ёлкі. Праз іх густыя верхавіны не прабіваецца сонца. А тут, у нізе, гушчар, цэлая плойма камароў, мошак, гарачыня. Здаецца, хоць бы на хвілінку дунуў ветрык. Вася ўсміхаецца і заўважае:

— Дома колькі дроў перасёк, а як вастрыць сякеру, не навучыўся...

І мы заўзята слухаем, як ён расказвае, што ўчора Косця, вопытны рабочы, які ўжо шмат год працуе ў лясніцтве, вучыў яго вастрыць сякеру.

— У лесабудаўніка лязо сякеры павінна быць, як брытва. Лязо павінна быць не прамым, а паўкруглым, вось так, бачыш...

І Косця пачаў паказваць, як трэба вастрыць. І таму мы сёння здзіўляліся, як гэта Вася ўмудраўся адным ударам ссекчы невялікае дрэўца, у той час, як іншым на гэта трэба было два, а то і тры ўдары. А Косця смяяўся і радаваўся за Васю. Яму спадабаўся гэты студэнт, сціплы, працалюбівы. І мы не на дзіва зацікавіліся косцiным умельствам.

Мы кожны дзень на многа перавыконваем норму. У душы дзякавалі Косцю. Цікава, чаму так бывае ў жыцці? Кругом лес, ты прасякаеш сабе дарогу, а ў памяці паўстае наш дарагі універсітэт, выкладчыкі, аўдыторыі, незабыўныя перадсесійныя дні ў бібліятэцы. На твары з'яўляецца ўсмешка, і ты забываешся на ўсё, а, здаецца, крочыш па светлых калідорах галоўнага корпуса. І толькі, калі на тваім шляху паяўляецца тоўстае дрэва, якое трэба ссекчы, думкі зноў толькі аб працы.

Не аднойчы нас бывала напатыкае ліўневы дождж, з громам і маланкамі. У лесе становіцца страшна. Кругом ўсё гудзе, нібы ляціць над табой сотня самалётаў. Прамакаем да ніткі. У «табары» сушым на агні вопратку.

Час ішоў вельмі хутка. Мы часцей паглядвалі на сваю мускулатуру. Перасталі лічыць на руках і нагах мазалі. Не заўсёды былі рады сонцу. Калі стаіць ціхая, гарачая пагода, вельмі цяжка працаваць, салёны пот залівае вочы. Хочацца піць, хоць насі за сабой флягу вады. Аднойчы тэмпература даходзіла амаль да 40 градусаў. З Васі смяяліся, жартавалі, што ён высушыў усе лужы на ўчастку. Кожнаму хацелася выпіць хоць глыток халоднай вады. З фляжкі піць не хочацца. Там вада зусім цёплая.

У вольны ад работы час падарожнічаем далёка-далёка ад нашага «табара». Мясцовыя жыхары, а таксама турысты вельмі цікавяцца Кадалінскімі палацамі, якія амывае рэчка Кадалінка. Мясціна гэта названа так таму, што на вяршынях гор знаходзяцца непаўторнай прыгажосці каменні, якія нечым нагадваюць будынкі палацаў. Нездарма гэтую мясціну называюць цудам прыроды. Мы не змаглі абыйсці ўсе скалы; мясцовасць была незнаёмая, дый за адзін дзень зрабіць гэта не было ніякай мажлівасці. Мясцовыя жыхары шмат цікавага расказвалі аб нейкай пячоры ў вялізнай скале, форма якой зусім падобна на галаву дзеда. Мы арыентуемся на адну з самых вялізных скал. Здалёк нам здавалася, што на ёй сядзіць нейкая птушка, але калі падышлі бліжэй, то ўбачылі нібы каменнага гіганта-вярблюда. Неўзабаве мы падышлі і да «варот». «Вароты»—гэта вузкая шчыліна ў скалах, праз якую можна прайсці з аднаго боку Паўднёвага грэбня на другі. Калі мы праходзілі праз «Вароты», то надоўга нашу ўвагу прыкоўвала плоскасць стромкай скалы. Тут мы ўбачылі небывалага памеру чалавечы след. Здавалася, што на скалу наступіла вялізная і магутная нага волата. Вельмі добра відаць пальцы і пятка нагі. Многа падобных выветрыванняў відаць і на іншых скалах. Шмат тут і кратэраў. І калі я каму-небудзь паказваю здымкі такіх кратэраў, то ўсе прыходзяць да вывадаў, што гэта паверхня месяца, якую зафатаграфавалі з блізкай адлегласці.

Неяк мы надыбалі на вельмі прыгожыя таёжныя кветкі. Нарвалі па жмені. Прыйшлі ў «табар», паставілі ў сябе ў палатках і нехта заўважыў:

— Вось бы гэтулькі прыгожых кветак у наш студэнцкі інтэрнат...

І цяпер неяк незвычайна адчуваеш сябе,—пасля жыцця ў лесе, у палатках,— у прасторных аўдыторыях, студэнцкім пакоі інтэрната. Многія з нас напісалі сваім сябрам па рабоце лісты. Моцная паміж намі завязалася сяброўства. На наступны год зноў сустрэнемся ў Забайкальскай тайзе.

**Ю. АГАРАДНІЧЭНКА.**

Рэдактар А. ЛОЙКА.

АТ 01812 Адрас рэдакцыі: г. Мінск, БДУ імя Ул. І. Леніна, галоўны корпус, п. 212, тэл. 2-07-19. Друкарня выдавецтва «Звязда». Зак. № 840.